ПАЛІТЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ ІДЭІ Ў БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ЯК ПЕРАДУМОВЫ АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

ГОЛУБЕВА Л.Л.,
дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы
і права юрыдычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
кандыдат юрыдычных навук, дацэнт

ПРАНЕВІЧ Д.А.,
аспірант Нацыянальнага цэнтра заканадаўства
і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь

Анатацыя. *Прааналізаваны асноўныя напрамкі ў развіцці палітыка-прававой думкі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.: ліберальна-буржуазны, кансерватыўна-манархічны, рэвалюцыйна-народны (рэвалюцыйна-дэмакратычны). Разгледжаны палітычныя і прававыя погляды Я.Снядэцкага, В.Страйноўскага, І.Лабажэўскага, К.Каліноўскага, Я.Купалы, І.Луцкевіча, Я.Коласа, Ф.Багушэвіча, М.В.Доўнар-Запольскага. Паказана, што гэтыя ідэі аказалі ўплыў на адраджэнне беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст.*

Уводзіны. У савецкі перыяд развіцця беларускай дзяржаўнасці не праводзіліся даследаванні на гісторыка-прававую тэматыку. Толькі ў 90-я гг. XX ст. пачалі друкавацца асобныя артыкулы, навуковыя працы І.У.Вішнеўскай, А.А.Козела, С.А.Падокшына, С.Ф.Сокала, П.Г.Чыгрынава, В.Ф.Шалькевіча, у якіх навукоўцы аналізавалі погляды мысліцеляў розных перыядаў станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці на дзяржаву, права, палітыку, заканадаўства. Аднак адносна палітычных і прававых ідэй у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. такіх прац няшмат.

Мэтай навуковага артыкула з'яўляецца даследаванне асноўных напрамкаў у развіцці палітыка-прававой думкі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст., а таксама аналіз поглядаў на дзяржаву, права, палітыку, заканадаўства некаторых прадстаўнікоў разглядаемага перыяду: Я.Снядэцкага, В.Страйноўскага, І. Лабажэўскага, К.Каліноўскага, Я.Купалы, І.Луцкевіча, Я.Коласа, Ф.Багушэвіча, М.В.Доўнар-Запольскага.

Асноўная частка. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 гг. галоўным пытаннем нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі стала адраджэнне дзяржаўнасці, пошук шляхоў да нацыянальнай самастойнасці.

У грамадскім жыцці Расіі ў XIX ст. вялася вострая ідэйна-палітычная барацьба, у якой вылучыліся тры асноўныя плыні: ліберальна-буржуазная; кансерватыўна-манархічная; рэвалюцыйна-народная, або рэвалюцыйна-дэмакратычная [1, с. 178–179].

Асноўнымі рысамі ліберальна-буржуазнага напрамку ў развіцці палітыка-прававой думкі Беларусі былі імкненне да вызвалення асобы ад тых абмежаванняў, што накладваюцца традыцыяй, грамадскай структурай ці законамі, пэўнае ўяўленне аб сацыяльным прагрэсе і вера ў яго ажыццяўленне, паступовасць прагрэсу і паслядоўнасць усіх яго стадый, адмаўленне ад нелегальнай і насільнай барацьбы. Лібералізм прадугледжваў поўную свабоду, свабоду сумлення і свабоду слова, патрабаваў у сферы дзяржаўнага ладу канстытуцыйнага парадку, мясцовага самакіравання, свабоды асобы ад дзяржаўнай апекі, адмены саслоўных прывілеяў, палітычнай свабоды (свабоды слова, сходаў, саюзаў), удзелу народа ў правасуддзі. У эканамічнай сферы лібералізм патрабаваў свабоду гандлю і працы [2, с. 109–129]. Упершыню прынцыпы лібералізму былі сфармуляваны англійскім эканамістам А.Смітам у 1776 г.

У Беларусі ідэі лібералізму пачалі распаўсюджвацца ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. сярод выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, а таксама адукаванага гарадскога насельніцтва. У тагачасных перыядычных выданнях («Дзённік Віленскі», «Тыгоднік

Віленскі») крытыкаваліся царкоўнае выхаванне, цемра езуітаў, даказвалася неабходнасць вызвалення сялян, жаночай адукацыі, надання грамадзянскіх правоў яўрэям.

Разам з гэтым ліберальная думка першай трэці XIX ст. была сканцэнтравана на вырашэнні наступных галоўных сацыяльна-палітычных праблем:

– рэфармаванні сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў духу яе дэмакратызацыі і лібералізацыі. Выдатным мысліцелем, педагогам, радыкальным рэфарматарам сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў Беларусі быў Я.Снядэцкі (1756–1830). Яго погляды былі выкладзены ў лістах, навуковых працах і перш за ўсё ў манаграфіі «Жыццё і літаратурная дзейнасць Гуга Калантая» (1814), у якой мысліцель распрацаваў цэласную праграму радыкальнай рэформы сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Я.Снядэцкі лічыў, што «вышэйшая ўлада» не павінна займацца дробнымі пытаннямі адукацыі, а ўсю сваю ўвагу павінна звярнуць на склад і становішча настаўнікаў і выкладчыкаў, бо гэта «крыніца, ад якой усё залежыць». Мысліцель бачыў дзве галоўныя мэты грамадскай адукацыі і выхавання. Па-першае, падрыхтоўка людзей да дзяржаўнай службы і правільнага вядзення прыватных спраў, і, па-другое, «выяўленне дараванняў і талентаў, фарміраванне іх і выхаванне на карысць народную». Пры гэтым ён лічыў, што таленты належыць шукаць ва ўсіх саслоўях, што «ўся ўвага школы павінна быць звернута на народ» [3]. На яго думку, неабходна імкнуцца да стварэння такой сістэмы адукацыі, якая не перашкаджала б «нікому рухацца далей наперад у сваёй адукацыі, а наадварот, дапамагала». У аснову дыдактычнага працэсу павінны быць пакладзены прынцыпы Ж.Ж.Русо, паводле якіх вучань «павінен працаваць як сялянін, а мысліць як філосаф» [1]. На падставе гэтых ідэй, дзякуючы тэарэтычнай і практычнай дзейнасці Я.Снядэцкага, як сярэдняя, так і вышэйшая адукацыя ў Беларусі дасягнула высокага ўзроўня;

– вырашэнні сялянскага пытання. Прадстаўнікі ліберальнага напрамку выступалі за ліквідацыю асабістай залежнасці сялян ад памешчыкаў і прызнавалі роўнасць усіх грамадзян перад законам [1; 3].

У 1808 г. В.Страйноўскі (1759–1834) выдаў у Вільні кнігу «Аб пагадненні памешчыкаў з сялянамі», у якой паставіў праблему адмены прыгоннага права і сцвярджаў, што прыгонны стан супярэчыць натуральнаму праву і стрымлівае прагрэс грамадства. Таму неабходна ліквідаваць асабістую залежнасць сялян ад памешчыкаў. В.Страйноўскі выказваўся за наданне сялянам асабістай свабоды, а таксама права набыцця зямлі, якая павінна заставацца ўласнасцю памешчыкаў [2].

Таксама адзначым, што пачынаючы с 1815 г. у друку ўздымалася сялянскае пытанне. Мысліцелі выказваліся за змякчэнне прыгоннага права і за прававое ўрэгуляванне адносін паміж памешчыкамі і сялянамі. Разам з тым прадстаўнікі каталіцкай царквы таксама выказваліся за змякчэнне прыгоннага права, аднаўленне страчанай дзяржаўнасці ў той ці іншай форме [2]. У цэлым жа, калі гаварыць пра ліберальную думку, то ў першай палове XIX ст. у Беларусі сфарміраваліся нелегальныя цэнтры радыкальна-ліберальнай («Дэмакратычнае грамадства») і памяркоўна-ліберальнай («Віленскае дваранскае грамадства») апазіцыі, якія ўвайшлі ў склад садружнасці польскага народа. У 1857–1864 гг. фарміраванне ліберальнага грамадскага руху ў Беларусі актывізавалася. У 1881–1905 гг. пачаліся афармленне лібералізму як палітычнай плыні і стварэнне палітычнай ліберальнай апазіцыі. Лідэры апазіцыі У.Віткевіч, У.Мятлін, А.Аляксандраў і інш.) увайшлі ў склад партыі «Народнай свабоды». Да вясны 1906 г. у Магілёве і Пінску аформіліся яе групы. Аднак з прычыны слабасці сацыяльнай базы, адсутнасці земстваў, вышэйшых навучальных устаноў і іншага моцная ліберальная апазіцыя ў Беларусі ў межрэвалюцыйны перыяд у 1907–1917 гг. не аформілася [3].

Прадстаўнікі кансерватыўна-манархічнага напрамку адмоўна ставіліся да хуткіх змен і новаўвядзенняў. Кансерватызм сфарміраваўся на мяжы XVIII–XIX стст. як рэакцыя на ідэі эпохі Асветніцтва. Кансерватызм абараняў веру супраць розуму, традыцыю супраць свабоднага пазнання, іерархію супраць роўнасці, калектыўныя каштоўнасці супраць індывідуалізму, боскія ці натуральныя законы супраць грамадскіх. Кансерватары

крытыкавалі змест канстытуцый, заснаваных на прынцыпах «натуральнага права», ставілі пад сумненне ідэі «грамадскага дагавора», прынцыпы суверэнітэту народаў і правоў чалавека. Асноватворнымі паняццямі для іх былі «гісторыя», «жыццё», «нацыя». Аднак кансерватыўная думка згаджалася з прынцыпамі канстытуцыйнай дэмакратыі і індывідуальных правоў, з неабходнасцю асцярожных і паступовых сацыяльна-эканамічных змен [3, с. 178–195]. Прадстаўніком кансерватыўнай думкі, праціўнікам ліберальных асветніцкіх ідэй быў І. Лабажэўскі (каля 1750–1826).

Кансерватыўная плынь у Расійскай імперыі пачала складвацца ў час першых ліберальных рэформаў Кацярыны ІІ сярод царскіх чыноўнікаў і памешчыкаў. Шырокая дваранская кансерватыўная апазіцыя склалася ў 1850-я – пачатку 1860-х гг. У ходзе абмежавання і ажыццяўлення сялянскай рэформы 1861 г. Аднак арганізацыйна яна не аформілася. У другой палове 1860-х гг. кансерватыўнае дваранства Беларусі выступіла за захаванне рэшткаў прыгону, ліквідацыю інстытута міравых пасрэднікаў і іншае, хоць выказвалася за земскую і судовую рэформы. Прадстаўнікі кансерватызму у Беларусі выступалі за захаванне патрыярхальных адносін.

Кансерватыўная ідэйная плынь не здолела дастаткова ярка праявіцца ў грамадска-палітычнай думцы і руху Беларусі ў пачатку ХХ ст.

Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у грамадскай думцы Беларусі выразна акрэсліўся ў канцы 50-х гг. ХІХ ст., калі ў Расіі пачаўся новы рэвалюцыйна-дэмакратычны этап вызваленчага руху. Яго ідэолагі А.Герцэн, М.Чарнышэўскі, М.Бакунін, М.Агараў, М.Дабралюбаў абгрунтоўвалі неабходнасць звяржэння царскага самадзяржаў'я, ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, перадачы зямлі і ўсіх срокаў вытворчасці народу, усталявання народаўладдзя са свабодным нацыянальна-палітычным самавызначэннем народаў і інш. Рэвалюцыйны дэмакратызм прадстаўляў сабой адзінства прынцыпаў і ідэй светапогляднага характару, сістэму палітычных каштоўнасцей, у аснове якой ляжала ідэя гістарычнага прадвызначэння працоўнага народа, тэндэнцый сялянскага сацыялізму, якія мелі пэўнае распаўсюджанне ў грамадска-палітычнай самасвядомасці насельніцтва [3, с. 193–213; 4, с. 102–103].

Прадстаўніком рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку з'яўляўся К.Каліноўскі (1838–1864). Яго спадчына: сем нумароў газеты «Мужыцкая праўда», шэраг рэвалюцыйных інструкцый, заклікаў, загадаў, а таксама некалькі лістоў: «Пісьмы з-пад шыбеніцы» і інш. «Пісьмы з-пад Шыбеніцы» былі пазней надрукаваны пад назвай: «Да беларускага народа. Пісьмо з-пад шыбеніцы Канстанціна Каліноўскага». У гэтым творы крытыкавалася палітыка царызму ў Беларусі, выкрывалася гвалтоўная русіфікацыя, з гневам гаварылася аб забароне вучобы ў школах на рускай мове.

К.Каліноўскі крытыкаваў феадальна-прыгонніцкія адносіны ў Расіі сярэдзіны ХІХ ст. Ён глыбока раскрыў сутнасць прыгонніцкай эксплуатацыі ва ўсіх яе формах, паказаў выключна цяжкае становішча сялян Беларусі, асабліва дзяржаўных. Царскіх чыноўнікаў ён параўноўваў з саранчой, што знішчае на сваім шляху ўсю расліннасць. Ён выкрываў суд царскай Расіі, які быў толькі дапаўненнем царскай адміністрацыі і поўнасцю залежыў ад яе. Параўноўваў царскія суды з «воўчай зграяй», дзе не разбіраюцца па сутнасці, а рвуць на часткі, як могуць [5, с. 198–201].

К.Каліноўскі крытыкаваў капіталізм, у якім ён бачыў толькі новую сістэму эксплуатацыі чалавека чалавекам. Ён быў праціўнікам эксплуататарскага ладу, прыхільнікам карэннай перабудовы грамадства на новых, справядлівых пачатках. Гэта крытыка садзейнічала класаваму асветніцтву сялян, выхоўвала ў іх нянавісць да памешчыкаў і самадзяржаўя, рыхтавала іх да барацьбы за перамогу новых сацыяльных прынцыпаў [4, с. 109–115]

Рэвалюцыянер-дэмакрат марыў раздаць усю зямлю сялянам. Ён быў прыхільнікам ідэалаў сялянскага абшчыннага сацыялізму, выступаў за адмену ў будучым грамадстве ўсіх класавых, нацыянальных і рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў. Лічыў, што чалавека

патрэбна ацэньваць па яго рэальных справах і заслугах. Новае грамадства павінна быць грамадствам працоўных.

Мысліцель бачыў, што пануючыя класы не клапоцяцца аб адукацыі і выхаванні сялянскіх дзяцей. Выступаў супраць таго, што быццам бы толькі выбраныя здольны вучыцца і займацца навукай. Галоўнай умовай пашырэння асветы лічыў карэнную змену існуючых сацыяльна-палітычных адносін. Пакуль народ не будзе свабодным, не будзе ні справядлівасці, ні багацця, ні навукі. К.Каліноўскі выказваўся за ўсеагульную адукацыю і выхаванне, якімі будзе займацца непасрэдна дзяржава, за тое, каб школа фарміравала ў дзяцей высокія грамадскія якасці і гуманістычныя ідэалы. Формай праўлення, на яго думку, павінна быць дэмакратычная рэспубліка [1; 5].

Ажыццяўленне ўсіх сваіх сацыяльных праектаў і планаў ён звязваў з сялянскай рэвалюцыяй. Толькі народная рэвалюцыя можа прынесці сялянам жаданую зямлю і свабоду. «Свабоду» можна заваяваць толькі шляхам узброенай барацьбы. Лічыў, што ў рэвалюцыі побач з сялянствам могуць удзельнічаць гараджане і студэнты, бо ва ўсіх іх агульныя інтарэсы. Могуць удзельнічаць таксама і памешчыкі, але на такой ідэйнай платформе, якая б не супярэчыла інтарэсам сялян.

Адначасова на тэрыторыі Беларусі выказваліся прагрэсіўныя і перадавыя ідэі, якія таксама паўплывалі на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст.

Так, Я.Купала (1882–1942) з 1914 г. рэдагаваў «Нашу ніву». Рэвалюцыйны дэмакрат, ён звяртаўся да ўсіх працоўных з заклікам паўстаць «усім разам» па прыкладу рускага народа супраць самадзяржаў'я. Адзінства і з'яднанасць – гэта гарантыя поспеху ў барацьбе супраць самадзяржаўя, гэта ўмова для беларускага народа пачаць «людзьмі звацца» [3].

Я.Купала бачыў новыя тэндэнцыі ў грамадскім жыцці Беларусі ў пачатку XX ст.: абуджэнне і фарміраванне сацыяльнай і нацыянальнай самасвядомасці, з'яўленне веры ў свабодную будучыню. Свабода, на яго думку, – гэта катэгорыя сацыяльная. Факт таго, што сялянін быў пастаўлены ў залежнае становішча панаваннем антынародных сацыяльных сіл, вымушаны быў працаваць на іншых, ён кваліфікаваў як знявагу чалавечай годнасці, несумяшчальную з вызначэннем чалавека працы як гаспадара ўсёй зямлі. Важнае месца ў яго творчасці займае і вырашэнне нацыянальнага пытання. Ён заклікаў да развіцця нацыянальнай культуры, выступаў як прапагандыст дружбы народаў, паказаў спробы пануючых класаў ствараць варожасць паміж працоўнымі розных нацыянальнасцей і, у першую чаргу, паміж брацкімі народамі – беларускім, украінскім і рускім. Я.Купала прапагандаваў гуманна-дэмакратычныя погляды на праблему вайны і міру [3].

І.Луцкевіч (1881–1919) працаваў сумесна з Я.Купалам у «Нашай ніве». Ён прапагандаваў ідэю аб беларускай палітычнай арганізацыі, якая павінна была арганізоўваць увесь беларускі нацыянальна-адраджэнцкі рух. Праводзіў і абгрунтоўваў думку аб тым, што беларускі народ не менш за іншых мае поўнае права на самастойнае нацыянальнае вызначэнне і існаванне. І.Луцкевіч адстойваў ідэю адраджэння беларускага народа. Выступаў за незалежнасць Беларусі, падкрэсліваў, што настаў час рэалізацыі нацыянальных ідэалаў беларускага народа. Патрэбна, каб беларускі горад стаў своеасаблівым інтэлектам вёскі. Інтэлігенцыя павінна была стаць неразрыўнай часткай беларускага народа і мець «супольны язык» з народам. Беларускі народ павінен стаць гордым прадстаўніком сваёй культуры. Важнейшым фактарам развіцця беларускай нацыянальнай культуры з'яўлялася адукацыя на роднай мове [1; 3].

Я.Колас (1882–1956) – прадстаўнік рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі ў пачатку XX ст. Актыўна прапагандаваў рэвалюцыйныя ідэі сярод сялян. Ён пісаў пра сябе: «У 1905 г. я быў ужо сапраўдным ворагам самадзяржаўя і ў гэтым напрамку вёў працу». У гэты перыяд для яго творчасці характэрны крытычна-выкрывальніцкі характар. Ён растлумачваў несумяшчальнасць інтарэсаў народа і эксплуататарскіх слаёў, адзначаў антынародную сутнасць тагачасных

сацыяльных інстытутаў, гістарычную асуджанасць грамадскага ладу, які заснаваны на прыгнёце і знявазе простага чалавека. У 1920–1930-х гг. ён выступіў супраць дзяржаўнай сістэмы, якая існавала ў той час, лічачы яе непрымальнай і антынароднай. Да народнай свабоды існуе толькі адзін шлях – барацьба, рэвалюцыя [1; 3].

Цётка (А.С.Пашкевіч) (1876–1916) была не толькі прыхільніцай рэвалюцыйнай барацьбы, удзельнічала ў падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Вільні, якая мела мэтай падрыхтоўку да ўзброенага паўстання. Заклікала народ да свабоды. Свабоду звязвала з дасягненнем канкрэтных сацыяльных мэт: знішчэннем самадзяржаўя, надзяленнем сялян зямлёй, нацыянальным самавызначэннем беларускага народа, развіццём яго нацыянальнай культуры.

Ф.Багушэвіч (1840–1900) добра знаў беларускія помнікі права, такія як агульназемскія граматы (прывілеі), статуты ВКЛ, гістарычныя хронікі і летапісы. Ён цвёрда верыў у адраджэнне беларускай культуры і нацыянальнай дзяржаўнасці. Ён з'яўляўся прадвеснікам нацыянальнага ўзраджэння, змагаром за ўзраджэнне нацыянальнай культуры. Галоўным героем яго твораў з'яўляўся беларускі селянін, якога эксплуатавалі царскія чыноўнікі, суд, казна, паны [3; 6].

Адным з першых выразную нацыянальную накіраванасць сваіх даследаванняў праявіў беларускі гісторык М.В.Доўнар-Запольскі (1867–1934). Даследаванні па гісторыі дзяржавы і права ён праводзіў у цеснай узаемасувязі з эканамічным становішчам Расіі і Беларусі. У працах М.В.Доўнар-Запольскага значная ўвага была нададзена даследаванню гісторыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, былі закрануты пытанні дзяржаўна-прававога развіцця, пытанні права, судовага ладу і судаводства [6].

Заключэнне. Беларуская інтэлігенцыя ў разглядаемы перыяд абвяшчала і паслядоўна адстойвала канкрэтную сацыяльна-палітычную праграму: знішчэнне самадзяржаўя, дэмакратызацыя грамадскага жыцця, ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, надзяленне сялян зямлёй, свабоднае развіццё культуры. Інтарэсы працоўных і буржуазна-памешчыцкага блоку, на іх думку, несумяшчальны. Мысліцелі-дэмакраты, выступаючы ад імя беларускага народа, выражалі пераважна інтарэсы працоўнага сялянства. Свае ідэалы і надзеі яны звязвалі з гэтым класам. Лічылі неабходным вырашыць аграрнае і нацыянальнае пытанні. Дасягненне народнай свабоды яны звязвалі з рэвалюцыйнымі дзеяннямі.

Палітычныя і прававыя ідэі, якія выказваліся ў Беларусі ў XIX ст. знакамітымі людзьмі таго часу аказалі значны ўплыў на развіццё нацыянальный ідэі, самасвядомасці грамадзян і такім чынам актыўна паўплывалі на палітычныя працэсы, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст: утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ

1. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзежнае навуковае суполніцтва, 2002. – 248 с.

2. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004. – 271 с.

3. Чыгрынаў, П. Г. Грамадская думка ў Беларусі: палітыка-гістарычны аспект (X – пач. XX стст.) / П. Г. Чыгрынаў. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 1996. – 229 с.

4. Сокал, С. Ф. Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі : лекцыйны матэрыял / С. Ф. Сокал. – Магілёў : Абласная друкарня, 1999. – 142 с.

5. Асветнікі зямлі Беларускай : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.

6. Белорусская юридическая энциклопедия : в 4 т. / Белорусский государственный университет, Юридический факультет ; [редкол.: С. А. Балашенко [и др.]. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007–2011. – 2011. – Т. 3 : П–С. – 624 с.

Матэрыял паступіў у рэдакцыю 30.04.2021